# Маладзечанскі акцэнт

## Як Палац культуры ў райцэнтры стаў адным з найлепшых у краіне



Палац культуры г. Маладзечна, 2022 год

### Наказ Прэзідэнта

Палац культуры – арганічная архітэктурная дамінанта Маладзечна, цэнтр грамадскага прыцягнення, візітная картка аднаго з самых густанаселеных гарадоў сталічнай вобласці. Ён настолькі натуральна і незаменна ўліўся ў гарадское асяроддзе і ў жыццё маладзечанцаў, што, здаецца, быў тут заўсёды.

Між тым з'яўленне гэтага характва ў цэнтры горада, які славіцца сваімі музычнымі і культурнымі традыцыямі, – амаль дэтэктыўная гісторыя. Яшчэ на пачатку 1980-х мясцовыя ўлады настойліва дамагаліся будаўніцтва вялікага, шматфункцыянальнага аб'екта культуры. У горадзе не было ніводнай прыдатнай пляцоўкі для маштабных мерапрыемстваў, а творчыя калектывы нярэдка існавалі ў вельмі далёкіх ад высокіх творчых памкненняў умовах.

У 1988 годзе ў балоцістай нізіне, заваленай бураломам, з'явіліся людзі і будаўнічая тэхніка. Спраектаваў палац мінскі архітэктар Уладзімір Даніленка. Гэта праца стала для яго знакавай. Пазней у інтэрв'ю, адказваючы на пытанне, на якім з уласных тварэнняў перш за ўсё пакінуў бы мемарыяльную шыльду са сваім імем, аўтар цэлага шэрагу вядомых аб'ектаў грамадскай і праваслаўнай архітэктуры назваў Палац культуры ў Маладзечне.

Ужо былі ўзведзены сцены, але «нечакана», праз недахоп фінансавых сродкаў, будоўля застапарылася. Як аказалася, на гады.

Але час мяняўся. Краіна абрала свайго Прэзідэнта. У 2001 годзе Аляксандр Лукашэнка прыехаў у Маладзечна на адкрыццё чарговага Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Падчас візіту кіраўнік дзяржавы наведаў гарадскія даўгабуды, у тым ліку Палац культуры. Пасля дэталёвага знаёмства з сітуацыяй без сумневу вынес цвёрды вердыкт: «Будаўніцтва аднавіць неадкладна! Усе недаробкі ліквідаваць! Роўна праз год сустракаемся на ўрачыстым адкрыцці Палаца культуры!»

Так і здарылася. 17 кастрычніка 2002 года Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел ва ўрачыстай

цырымоніі ў Маладзечне. Адкрыццё Палаца культуры стала хвалюючай і шчаслівай падзеяй. Пачыналася новая эпоха ў культурным жыцці Маладзечанскага краю, яна адкрывала вабныя і нязведаныя гарызонты…

У Кнізе ганаровых гасцей Прэзідэнт зрабіў запіс пад нумарам 1: «Глыбока перакананы, што гэты Палац стане прыцягальным для ўсіх культурным цэнтрам, агменем духоўнага ўзбагачэння людзей, любімым месцам сустрэч з Прыгожым, месцам росквіту новых талентаў, якія праслаўляць нашу Беларусь».

Прэзідэнцкі наказ калектыў палаца, які ўзначаліла Святлана Сарока, успрыняў як вялікі давер і адказнасць. Бо нават для прафесіяналаў гэта быў сур'ёзны выклік, сапраўдны іспыт. Час пакажа, што яны вытрымаюць яго з гонарам: за лічаныя гады Палац культуры горада Маладзечна стаў адной з вядучых культурных пляцовак Беларусі.

І сказаць сёння, што ён мае вялікую ролю ў жыцці Маладзечна і сталічнай вобласці, значыць… не сказаць нічога. Гэта культурны і грамадскі цэнтр, дзе сканцэнтраваны моцныя творчыя сілы і адбываюцца галоўныя падзеі. Гэта прыцягальнае месца для ўсіх, хто хоча жыць насычана і цікава, а вольны час бавіць змястоўна і з карысцю. Грамадска-палітычныя акцыі да памятных дат і тэматычныя мітынгі, фестывалі і конкурсы, маладзёжныя форумы і квэсты, выставы ці мерапрыемствы для людзей сталага ўзросту – кожны праект па-свойму ўнікальны, з маладзечанскай разыначкай.

Раскажам толькі пра самае адметнае з 20-гадовага творчага шляху Палаца культуры.

## Выклік… самім сабе

Надта ж цікавы горад гэтае Маладзечна! Бадай, вы не знойдзеце тут ніводнага чалавека, які сказаў бы, што ён не задаволены культурным жыццём. Каб пабачыць усё, што праводзіць Палац культуры (а гэта, заўважце, каля чатырохсот мерапрыемстваў штогод, кожнае дзясятае – міжнароднага, рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў), сярэднестатыстычнаму гараджаніну банальна не хопіць часу. Але ён дакладна знойдзе яго, каб пабыць на маладзечанскіх фестывалях і конкурсах. Гэта заўсёды шматлюднае,




**Адным з першых уладальнікаў прэміі Беларускага саюза кампазітараў «Музычны Алімп» стаў народны артыст Беларусі кампазітар Леанід Захлеўны. Заслужаную ўзнагароду ўручыла старшыня творчага аб'яднання Алена Атрашкевіч**

цікавае і відовішчнае дзейства, якое мае вялікі эстэтычны і выхаваўчы эфект.

Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі – безумоўна, галоўная творчая вяршыня Палаца культуры. На працягу дваццаці гадоў ён натхняльнік і арганізатар галоўных пляцовак музычна-паэтычнага форуму, на яго базе працуе фестывальная дырэкцыя. Разнастайная і насычаная афіша вабіць у Маладзечна людзей з усёй краіны.

У 2011 годзе ў горадзе з'явілася сучасная сцэнічная пляцоўка – Летні амфітэатр. З гэтага моманту пачаўся новы адлік гісторыі нацыянальнага фэсту, а праводзіць яго сталі штогод.

Кожны фестываль асаблівы, гэта заўсёды нешта адметнае. Але заўсёды застаецца галоўнае – шчырае імкненне пазнаёміць шырокую публіку з самабытнай нацыянальнай культурай, багатай музычнай і паэтычнай спадчынай, адкрыць новыя імёны.

На сёлетнім фестывалі з'явіўся новы праект, які прэтэндуе на тое, каб стаць яшчэ адной добрай традыцыяй нацыянальнага свята музыкі і паэзіі: Беларускі саюз кампазітараў на чале з Аленай Атрашкевіч упершыню ўручыў прэміі «Музычны Алімп» у розных

намінацыях аўтарам музыкі за захаванне нацыянальных песенных традыцый і стварэнне высокамастацкіх твораў і хітоў.

– З самага пачатку вырашылі: маючы ў сваім распараджэнні такі шыкоўны будынак палаца, ні ў якім выпадку не ператварацца ў «мястэчковую» ўстанову культуры, – гаворыць Святлана Сарока. – Заўсёды ставілі перад сабой, здавалася б, недасягальныя, але ясныя мэты. Гэта стымулюе творчы працэс, прымушае шукаць новыя, арыгінальныя рашэнні.

Характэрна, што менавіта ў Маладзечне дэбютаваў рэспубліканскі тэлефестываль аўтарскай песні «Дыханне струн», дзякуючы якому бардаўская творчасць у нашай краіне атрымала новы імпульс.

З усіх куткоў краіны летам 2016-га тут сабраліся прыхільнікі папулярнага песеннага жанру на фестываль «Залаты шансон». Маштабнае мерапрыемства палац арганізаваў сумесна з тэлеканалам АНТ. На сцэне Летняга амфітэатра ладзілі канцэрты нашых і расійскіх зорак, а на гарадскіх фестывальных пляцоўках запускалі паветраныя шары, праводзілі парад рэтра-аўтамабіляў, воднае тэатральнае прадстаўленне і аўтограф-сесіі артыстаў.

Чароўны свет харавых спеваў – гэта духоўны фестываль «Музыка душы маёй». Упершыню ён прайшоў у кастрычніку 2016 года. Удзельнікамі сталі самадзейныя і прафесійныя калектывы з Мінскай вобласці і сталіцы, а таксама парафіяльныя хоры з Маладзечна, Вілейкі, Ракава, Валожына, Мядзела і Дзяржынска. Праз два гады ў палацы адбыўся II адкрыты духоўны фестываль «Музыка душы маёй». У выставачным фае працавала выстава «Блажэнная Валянціна – духоўная заступніца зямлі Мінскай», на якой прэзентавалі работы ўдзельнікаў III Міжнароднага мастацкага пленэру «Святасць зямлі беларускай».

Буянствам фарбаў і эмоцый напоўніў культурнае жыццё «Маладзечна-2021» фестываль цыганскай песні і танца «Шатрыца». Ён пачаўся са святочнага квэста «Цыганы едуць». Цэнтральную частку горада запаланілі брычкі з музыкамі, коннікі, калядоўшчыкі на хадулях і… сапраўдны цыганскі табар з шатром варажбіткі, караоке, танцавальным майстар-класам, тэатральнымі пераўвасабленнямі і смачнымі пачастункамі.

**Летні амфітэатр у Маладзечне ўзвялі ў 2011 годзе спецыяльна да Рэспубліканскага свята «Дажынкі». Тут прайшлі асноўныя мерапрыемствы фестывалю-кірмашу працаўнікоў сяла**





**На сцэне – легендарная «Спадчына», ансамбль песні і танца імя Іосіфа Сушко, заслужаны аматарскі калектыў Беларусі, старажыл Палаца культуры**

Фестываль-конкурс джазавай і эстраднай музыкі JAZZ MOLO самы малады. Ён з'явіўся ў сакавіку 2022 года і, як лічаць найлепшыя джазмены краіны, мае ўсе шанцы на працяг гісторыі, а палац можа стаць галоўнай джазавай пляцоўкай Беларусі. За два фестывальныя дні выступілі 150 удзельнікаў, гледачы пачулі каля сотні цудоўных твораў. Гран-пры ў Баранавічы павёз мясцовы біг-бэнд Jazz Party. У палацы разлічваюць, што з цягам часу фестываль набудзе і міжнародны статус. А вопыт арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў такога ўзроўню тут ёсць. І немаленькі.

***«Вырашылі: маючы ў сваім распараджэнні такі шыкоўны будынак палаца, ні ў якім выпадку не ператварацца ў „местачковую“ ўстанову культуры».***

Адзін з красамоўных прыкладаў – Міжнародны турнір па спартыўных бальных танцах «Кубак Маладзечна». На рэйтынгавыя спаборніцтвы прыехалі спартсмены з 11 краін – больш як 300 (!) танцавальных пар. Два дні ў палацы былі распісаны літаральна па хвілінах. Федэрацыі танцавальнага спорту краін-удзельніц высока ацанілі турнір у Маладзечне. Для яго правядзення тут набылі спецыяльную «падлогу», а спартсменам забяспечылі ўсе неабходныя ўмовы.

Але як атрымалася займець на сваю пляцоўку прэстыжны турнір? Сакрэту няма: танцавальны спорт даўно ў фокусе ўвагі. Яго тут разглядаюць як выдатную магчымасць далучыць моладзь (і не толькі яе!) да прыгожага, а таксама папулярызаваць здаровы лад жыцця. Першы рэспубліканскі конкурс па спартыўных бальных танцах «Кубак Маладзечна» з удзелам больш як дваццаці клубаў прайшоў яшчэ ў 2004 годзе. Затым другі, у якім сапернічалі ўжо 94 танцавальныя дуэты. – Папулярнасць турніру ў Маладзечне няўмольна расла. І нарэшце чэмпіянат Беларусі! Такога яшчэ не было ў гісторыі беларускага танцавальнага спорту – каб падобныя спаборніцтвы праходзілі не ў сталіцы ці абласным цэнтры. Але менавіта ў Палацы культуры Маладзечна больш як тры сотні танцавальных пар з сарака клубаў на радасць публіцы дэманстравалі сваё віртуознае майстэрства.

Ці «Свет прыгажосці» – адкрыты конкурс па цырульніцкім майстэрстве, дэкаратыўнай касметыцы і пазногцевым сервісе. Ён аднагодак палаца. Сімвалічна, ці не праўда? Гэты прэстыжны турнір ведаюць ва ўсёй краіне. Ён дорыць яго ўдзельнікам і гледачам ні з чым не параўнальныя адчуванні, а

галоўнае – дае магчымасць спецыялістам з Беларусі і блізкага замежжа адточваць сваё майстэрства, выходзіць на больш высокі ўзровень, атрымліваць прызнанне прафесіяналаў індустрыі прыгажосці і кліентаў.

## Рэспект года, альбо Як разбуралі стэрэатыпы

2016-ы ў нашай краіне аб'явілі Годам культуры, а Маладзечна стала культурнай сталіцай, прыняўшы эстафету ад Брэста. Наданне гораду такога высокага статусу ў такі знакавы год – гэта асаблівая пашана і адказнасць для ўсіх гараджан, але найперш для работнікаў культуры.

– Выбралі Маладзечна, таму што ў горадзе назапашаны вялікі досвед працы ў галіне культуры, шмат цікавых творчых калектываў, выдатны Палац культуры і амфітэатр, – адзначыў на ўрачыстай цырымоніі тагачасны міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў.

Ад маладзечанцаў у 2016 годзе чакалі яркіх праектаў і крэатыву. Што ж, гэтыя надзеі апраўдаліся цалкам: палац падарыў гараджанам і гасцям горада больш за сотню (!) запамінальных культурных падзей.

Своеасаблівымі «хэдлайнерамі» года сталі мегапраект «Майстры мастацтва – культурнай сталіцы Маладзечна», самабытнай жамчужынай у якім бліснуў канцэрт вядучых творчых калектываў і выканаўцаў Мінскай вобласці, і Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі. Гэтым разам яго прысвяцілі памяці Уладзіміра Мулявіна – яму ў 2016-м магло б споўніцца 75.

У міжнародным творчым праекце «Маладзечанцы – роднаму гораду» ўзялі ўдзел знакамітыя маладзечанцы, былыя выпускнікі музычнага каледжа імя М.К. Агінскага, а цяпер вядучыя салісты сусветнай опернай сцэны.

На любы густ і для розных узростаў, высокае патрыятычнае гучанне і забаўляльны характар – па-за ўсякім сумневам, культурная палітра «Маладзечна-2016» магла ўразіць самага патрабавальнага гледача. Успомнім, напрыклад, абласны фестываль духавой музыкі «Майскі вальс» з удзелам найлепшых калектываў з Беларусі, Расіі, Літвы, Латвіі, Польшчы – з абавязковым марш-парадам аркестраў і ансамбляў мажарэтак. Або адкрытыя пленэры – мастакоў «Маладзечна ART» і скульптараў «Вернісаж камянёў», якія сабралі майстроў з розных краін.

Незабыўна прайшоў фестываль творчай моладзі Art-House, які аб’яднаў таленавітых прадстаўнікоў сучасных альтэрнатыўных напрамкаў. А яшчэ «Міс Маладзечна – 2016», прэмія «Рэспект года», конкурс «Сімвал маладога пакалення», крэатыўная пляцоўка «Арт-старт», фестываль этнічнай музыкі «Маладзечна-этна», свята «Маладзечна – горад маладосці» і фестываль творчых ініцыятыў «Час жыць!» – сапраўдны рай для моладзі!

За арганізацыю і правядзенне мерапрыемстваў у рамках рэспубліканскай акцыі «Культурная сталіца года» калектыву палаца прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

***«Гэта гонар, што менавіта ў Маладзечне з’явілася нацыянальная опера пра любімага народам героя».***

Разбураць стэрэатыпы – мабыць, адзін з улюбёных заняткаў каманды Палаца культуры. А яшчэ тут надзіва дакладна ўмеюць выбіраць партнёраў для ажыццяўлення самых смелых і неардынарных ідэй.

Гісторыя з опернымі пастаноўкамі ў Маладзечне якраз з гэтай серыі. Сёння «свая» опера на вялікай сцэне палаца ўспрымаецца як сама сабой зразумелая з’ява, хоць яшчэ адносна нядаўна многім здавалася немагчымай. Бо, акрамя выканальніцкага і аркестравага складнікаў, для пастаноўкі патрэбны касцюмы, афармленне сцэны, выраб мэблі і г. д. – гэта велізарная праца. Але энтузіязм і жаданне рухацца наперад, вопыт і энергія маладых зрабілі сваю справу.

«Замахнуўся на класіку» Маладзечанскі маладзёжны музычны тэатр, створаны тагачасным дырэктарам каледжа імя М.К. Агінскага Р.С. Сарокам. Атрымалася ўсё як належыць: плённы творчы саюз палаца і вядомай навучальнай установы падарыў



**Прэм'ера оперы «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт» у 2013 годзе стала знакавай падзеяй у культурным жыцці краіны**

маладзечанцам і гасцям горада цудоўныя імгненні сустрэч з высокім мастацтвам.

Спачатку была «Іаланта», апошняя опера П.І. Чайкоўскага. Галоўныя партыі выконвалі навучэнцы і выкладчыкі каледжа. На прэм'еры ў Палацы культуры прысутнічалі вядомыя дзеячы культуры і аўтарытэтныя музыканты, музыказнаўцы і журналісты. Пастаноўка мела шумны поспех і прымусіла задумацца пра тое, што высокае мастацтва можа развівацца не толькі ў сталіцы.

Затым класічныя «Травіята», «Яўгеній Анегін», «Кармэн». Але, несумненна, самая прыкметная пастаноўка «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт». Упершыню ў сваёй гісторыі Маладзечанскі народны маладзёжны музычны тэатр падрыхтаваў оперу на беларускай мове. Прэм'ера яе ў Палацы культуры стала знакавай падзеяй у культурным жыцці краіны. Зварот да шматграннай асобы Агінскага прыцягнуў увагу да нашай гісторыі і да выбітных людзей. «Гэта гонар, што менавіта ў Маладзечне з'явілася нацыянальная опера пра любімага народам героя», – адзначыў заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Рыгор Сарока.

Яшчэ пра стэрыятыпы. Калісьці цяжка было нават выказаць здагадку, што палац запрацуе не толькі як клубная ўстанова, а і як філармонія. Што ў Маладзечна паедуць артысты і нашай эстрады, і замежныя, і каманда палаца зможа паўнавартасна ўліцца ў шоу-бізнес. Але яны сталі першапраходцамі ў Мінскай вобласці, а, магчыма, і ў краіне. Больш як паўмільёна праграм пераканаўча сведчаць аб творчым патэнцыяле каманды, аб узроўні і магчымасцях пляцовак палаца.

Жыхары Маладзечна не адчуваюць сябе адарванымі ад канцэртнага і тэатральнага жыцця. Наадварот, у іх горад едуць са сталіцы, каб патрапіць на спектаклі вядомых тэатраў, канцэрты эстрадных зорак, легенд року і найлепшых творчых калектываў краіны, на балетныя пастаноўкі, навамодныя танцавальныя шоу, цыркавыя прадстаўленні і інтэрактыўныя спектаклі для дзяцей.

## Прастора творчасці

Клубныя аб'яднанні і творчыя калектывы – гэта альфа і амега, залаты актыў палаца. Іх тут 31, розных паводле відаў аматарскай творчасці, але падобных тым, што сабралі яны людзей несумненна таленавітых і захопленых, якія імкнуцца развівацца і

жыць цікава, дарыць радасць людзям. А гэта ні многа ні мала каля тысячы чалавек.

*«Калі гледачы выходзяць акрыленыя, з новымі сіламі, значыць, мы выканалі адну з галоўных задач культуры».*

За два дзесяцігоддзі на сцэне Палаца культуры і Летняга амфітэатра творчыя калектывы прэзентавалі мноства канцэртных праграм. Яны актыўна гастралююць, удзельнічаюць у мерапрыемствах абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, фестывалях і конкурсах. Больш як трыста Гран-пры і прызавых месцаў – пагадзіцеся, гэта важка! Выпускнікі студый палаца з'яўляюцца салістамі вядучых калектываў нашай краіны. І ці шмат устаноў культуры знойдзецца ў Беларусі, дзе 12 (!) аматарскіх калектываў носяць ганаровыя званні «Заслужаны», «Народны» і «Узорны»?!

«Дзякуй, Палац, што разнастаіш наша жыццё», – напісала «Маладзечанская газета». Бо кожны, незалежна ад узросту, знойдзе тут відовішча альбо занятак па душы. І нават у пандэмійны перыяд, калі праз абмежаванні на правядзенне масавых мерапрыемстваў палац часова застаўся без самага галоўнага – жывога кантакту з публікай, з тымі, каму падабаецца бавіць тут свой вольны час, выхад знайшлі: тэрмінова «ўключылі» анлайн-рэжым, літаральна за месяц «пераехалі» ў віртуальную прастору. Неацэннай дапамогай у працы стаў назапашаны за многія гады відэаархіў, ён дазваляе весці бесперапынную трансляцыю на працягу паўтара (!) года. У віртуальнай канцэртнай зале дэманструюцца не толькі ўласныя праекты, але і запісаныя ў садружнасці з тэлеканаламі «Сустрэчы ў Маладзечне» – сольныя праграмы вядучых калектываў Рэспублікі і СНД, спектаклі.

Перафармаціравалі і найлепшыя праекты палаца. Прычым папярэдне высветлілі меркаванні карыстальнікаў. Напрыклад, вельмі папулярны ў моладзі КВЗ. Падчас пандэміі каманды спаборнічалі, прадстаўляючы свае праграмы ў сацыяльных сетках. І тут эмоцыі таксама білі праз край, як у рэальным жыцці.

Праца анлайн упэўнена становіцца самадастатковым напрамкам дзейнасці палаца. З'яўляюцца пастаянна новыя праекты – тут чуйна рэагуюць на запыты часу і аўдыторыі. Юбілейны 2022 год папоўніўся яшчэ адным – ProDKLife, які расказвае пра самыя важныя, а таксама малавядомыя старонкі гісторыі палаца.

## Каб вочы гарэлі

Самы час адправіцца на невялікую экскурсію па палацы, зазірнуць у Летні амфітэатр і пазнаёміцца з адданымі сваёй прафесіі людзьмі, творцамі. Яны – высакакласныя прафесіяналы і патрыёты нацыянальнай культуры. Гэта каманда, якой пад сілу пераадолець любыя складанасці і праблемы дзеля таго, каб дарыць людзям радасць.

– Калі гледачы выходзяць акрыленыя, з новымі сіламі, значыць, мы выканалі адну з галоўных задач культуры – дапамаглі чалавеку ўзняцца над надзённымі праблемамі і над самім сабой, убачыць сябе новага, здольнага да лепшага, – разважае Святлана Сарока.

ЦІКАВОСТКІ

- *З моманту адкрыцця Палац культуры наведалі больш як 1 000 000 гледачоў, адбылося больш як 7000 мерапрыемстваў.*
- *У Палацы захоўваецца звыш 7000 сцэнічных касцюмаў.*
- *Адлегласць ад планшэта галоўнай сцэны да каласнікоў складае вышыню 9-павярховага дома.*
- *Супрацьпажарная заслона сцэны важыць 11 тон.*
- *Кожная люстра канцэртнай залы змяшчае 290 лямпачак.*






**Прыярытэтным напрамкам дзейнасці Палаца культуры з'яўляецца работа з дзецьмі і моладдзю**

Прафесіяналізм і «каб вочы гарэлі», жаданне рэалізаваць свой патэнцыял і ўменне ладзіць з іншымі – у камандзе палаца няма людзей выпадковых, абыякавых.

Амаль дваццаць гадоў адпрацавала намеснікам дырэктара па арганізацыйна-масавай рабоце Галіна Акулёнак, цяпер яе справу працягвае Маргарыта Шытыка.

– Калектыў – вялікая сіла, здольная тварыць цуды, і мы ўвасаблялі грандыёзныя праекты на радасць нашых гледачоў. Гэта былі яркія творчыя гады, якія давалі сілы рухацца наперад, тварыць і ствараць, – адзначае намеснік дырэктара па інфармацыйнай і канцэртнай дзейнасці Ала Яцына.

– Ганарымся тым, што змаглі зрабіць за два дзесяцігоддзі, – падтрымлівае калегу намеснік дырэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы Таццяна Бондар. – Але па-ранейшаму перад кожным мерапрыемствам хвалюемся, перажываем, каб усё было добра – так, як гэта ў нас прынята.

Пры ўяўнай «прастаце» Палац культуры насамрэч даволі складаны арганізм: у ім ажно чатырнаццаць структурных падраздзяленняў. «Забуксуе» адно з іх – збой пойдзе па ўсёй сістэме, а гэтага дапусціць нельга. Так што адказнасць у кожнага супрацоўніка каласальная.

Аддзел на чале са Святланай Адамушка клапоціцца пра адпачынак маладзечанцаў і гасцей горада. Працаваць у выхадныя для іх звыклая справа. Своеасаблівы эпіцэнтр самадзейнай творчасці – гэта аддзел, які ўзначальвае Валянціна Жалняровіч. Неверагодна, але факт: спецыялісты

ведаюць пайменна кожнага ўдзельніка шматлікіх калектываў палаца. Аматарскія аб'яднанні, клубы па інтарэсах і гурткі – прэрагатыва аддзела традыцыйнага мастацтва і аматарскай творчасці. Ім шмат гадоў паспяхова кіруе Наталля Цар.

Прыярытэтным напрамкам дзейнасці палаца з'яўляецца праца з моладдзю і дзецьмі. Спецыялісты пад кіраўніцтвам Таццяны Тарасавай ствараюць умовы для развіцця творчых здольнасцей юных маладзечанцаў, спрыяюць фарміраванню іх актыўнай жыццёвай пазіцыі, прышчапляюць маладому пакаленню эстэтычны густ.

***«Гэта былі яркія творчыя гады, якія давалі сілы рухацца наперад, тварыць і ствараць».***

Галоўная задача аддзела культурна-відовішчных мерапрыемстваў на чале з Валянцінай Грыцкевіч – арганізацыя і рэалізацыя гастрольных праектаў. Захопленыя водгукі айчынных і замежных зорак, гледачоў пераканаўча сведчаць аб прафесійнай працы гэтай службы. Дзякуючы Вікторыі Курылавай і яе падначаленым карыстальнікі сеткі заўсёды ў цэнтры культурных падзей. Аператыўную інфармацыю выдатна дапаўняюць фотасправаздачы Яўгена Стэльмаха. Дызайн палаца і амфітэатра, канцэртных пляцовак, выставачных фае і холаў, фотазон, рэкламнай прадукцыі распрацоўваюць маладыя спецыялісты мастацка-афармiцельскага аддзела. Узначальвае службу Таццяна Жалубоўская. Калектывы мастацкай самадзейнасці, эстрадныя і танцавальныя студыі палаца заўсёды вылучаюцца сваімі сцэнічнымі касцюмамі. Гэтую прыгажосць ствараюць мастакі-мадэльеры касцюмернай службы, загадвае якой Людміла Раўба.

Накіроўваемся ў парк Перамогі, дзе ўтульна размясціўся Летні амфітэатр – яшчэ адна канцэртная пляцоўка палаца, самая вялікая – месціць 2600 чалавек. Штогод сюды прыходзіць каля 50 тыс. гледачоў.

Адкрыты канцэртны комплекс узвялі ў 2011 годзе па праекце архітэктара Валянціны Цыёнскай спецыяльна да Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі». За кароткі час Маладзечанскі амфітэатр дзякуючы намаганням каманды палаца стаў адной з самых папулярных пляцовак Беларусі. Тут выступаюць эстрадныя артысты і салісты оперы, хоры і харэаграфічныя калектывы, джазавыя музыканты і аркестры, народныя ансамблі. Гэта галоўная лакацыя нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна».

У жніўні Палац культуры ўзначаліла Таццяна Цэгалка. Нельга сказаць, што чалавек яна чужы, бо некалі працавала тут і, безумоўна, добра разумее, які калектыў і якую справу ёй даверылі. Творчую планку папярэдні кіраўнік Святлана Сарока ўзняла высока, і задача не толькі ўтрымаць яе, а пайсці далей, умацоўваючы славу і аўтарытэт адной з найлепшых устаноў культуры ў нашай краіне.

…Чамусьці згадаліся простыя, немудрагелістыя радкі з гімна палаца:

На Цэнтральнай плошчы ў Маладзечне
Ёсць мастацтва знаны, светлы храм.
Наш Палац культуры будзе вечна,
Гледачы, служыць з любоўю вам!

А задумацца, дык лепей і не скажаш. З 20-годдзем, палац!

***Ігар СЯРГЕЕЎ***
***Фота з архіва Палаца культуры г. Маладзечна***